**Тэма. Гукі [ф], [ф’], літара Ф. Прафесія фатограф**

**Мэта** – забяспечыць знаёмства вучняў з літарай ***Ф/ф*** як знакам для абазначэння гукаў [ф] і [ф’] з дапамогай асваення спосабаў дзеянняў: распазнаваць у словах і выдзяляць гукі [ф], [ф’]; абазначаць іх літарамі; чытаць літару ***Ф/ф*** у складах, словах, сказах; забяспечыць развіццё ўменняў кантраляваць і ацэньваць вынікі дзейнасці; выхаванне пазітыўных адносін да прафесій бацькоў.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны этап. Паведамленне тэмы ўрока.**

**2. Выдзяленне і характарыстыка гукаў [ф] і [ф'].**

***Пастаноўка вучэбна-практычнай задачы.***

На дошцы прычэплены адваротным бокам малюнкі фарбаў, школьнай формы, фішак, філіна, геаметрычнай фігуры.

– Гульня “Назаві хутчэй!”

– На дошцы змешчаны выявы прадметаў.

Настаўнік апісвае прадметы:

– Яны бываюць яркія, халодныя, цёплыя, рознакаляровыя, акварэльныя, гуашавыя … (фарбы).

– Яна бывае прыгожая, круглая, авальная, вусная, пісьмовая, незвычайная, ваенная, школьная … (форма).

– Яна бывае статная, мускулістая, спартыўная, аб’ёмная, геаметрычная, вышэйшага пілатажу …(фігура).

– Ён бывае стары, мудры, вялікі, лупаты, начны … …(філін).

– Яны бываюць рознакаляровыя, ігральныя, на ўроках навучання грамаце яны сінія, зялёныя і чырвоныя, у некаторых з вас на партах зараз фіялетавыя
…(фішкі).

***Гукавы аналіз слоў, выдзяленне і характарыстыка вывучаемых гукаў.***

У словах «фарбы» і «форма» выдзяляецца першы гук [ф];

у словах «фігура», «філін», «фіялетавыя», «фішкі» выдзяляецца першы гук [ф’].

***Развіццё фанематычнага слыху. Распазнаванне гукаў [ф] і [ф’].***

– Будзем вучыцца адрозніваць гукі [ф] і [ф’] у словах.

– Калі пачуеце ў ім гук [ф], пляскайце ў далоні, калі пачуеце гук [ф’], сцісніце далоні ў кулачкі і плясьніце ў далоні кулачкамі. Калі ў словах гэтага гука няма, то сядзіце ціхенька.

*Фазан, вазон, фікус, фарэль, жырафа, фламінга, джэм, фея, кафэ, фуксія, фінік, фокус, воўк, фіялка.*

***Падбор слоў з гукамі [ф] і [ф***Знаёмства з літарай Ф.

***Увядзенне літары Ф для абазначэння гукаў [ф] і [ф’].***

Кірыліца дорыць вучням новую літару, якая абазначае гукі [ф] і [ф’].

Імя гэтай літары – «эф».

– Літара ***Ф*** умее абазначаць два розныя зычныя гукі: глухі цвёрды гук [ф] і глухі мяккі гук [ф’]. Будзьце ўважлівыя – імя літары і зычныя гукі, якія гэта літара ўмее абазначаць, не супадаюць!

– Каб назваць літару, трэба вымавіць яе «імя» – «эф».

– Каб прачытаць асобную літару, трэба вымавіць цвёрды гук – [ф].

***Графічны аналіз літары Ф.***

Выкарыстоўваюцца выявы літары ***Ф/ф*** у буквары і спадарожніку (с. 140). Праводзіцца параўнанне вялікай і малой, друкаванай і рукапіснай літар ***Ф/ф,*** літар ***Ф*** і ***О, ф*** і ***р***.

***Замацаванне ўяўленняў пра работу літары Ф.***

Арганізуецца гутарка па пытаннях:

– Які гук абазначаны літарай ***Ф*** у словах? Якая літара працуе для абазначэння гэтага гука ў слове – маленькая ці вялікая? *(Маленькая.)* Ці ёсць у класе вучні, чые імёны ці прозвішчы пачынаюцца з гукаў [ф] ці [ф’]? Гэтыя вучні могуць устаць. Няхай кожны, хто ўстаў, назаве сваё імя або прозвішча. Калі ўсё правільна, мы ўсе запляскаем у далоні. З якой літары напішам імёны і прозвішчы гэтых вучняў? *(З вялікай.)* Чаму?

Чытанне геаграфічных назваў у спадарожніку на с. 140, прагляд фотаздымкаў і відэаролікаў.

– У якім горадзе Беларусі вырабляюцьэлектрацягнікі «Штадлер-Мінск»?

**3. Замацаванне атрыманых ведаў пра літару *Ф*.**

***Зрокавае ўспрыманне літары Ф у словах.***

Прагляд мультыплікацыйнага фільма з выкарыстаннем QR-кода на с. 140 буквара.

***Гукавы аналіз слоў, суаднясенне іх са схемамі.***

**4. Навучанне чытанню складоў з літарай *Ф*.**

***Чытанне складоў “зычны + галосны”.***

Чытанне складоў з літарай ***Ф*** у буквары (с. 140, слупок з ракетай).

**5. Чытанне слоў з вывучанымі літарамі. Развіццё маўлення.**

***Знаёмства з сінонімамі (без ужывання тэрміна).*** Настаўнік просіць вучняў прачыт

***Чытанне слоў у слупках.*** Вучні чытаюць слупкі слоў на с. 141 буквара, звяртаецца ўвага на націск у іх. Настаўнік запытваецца, што аб’ядноўвае словы ў кожным слупку.

– Прачытайце словы, якія называюць спартсменаў. Прачытайце слова- назву прафесіі чалавека.

**6. Чытанне тэкстаў. Развіццё маўлення.**

***Работа з вершамі У. Мацвеенкі “Фігурысты” і Н. Галіноўскай “Фатограф”.***

Чытанне вершаў настаўнікам. Гутарка па пытаннях: Хто такія фігурысты? Кім уяўляе сябе хлопчык?

Што вы ведаеце пра прафесію фатографа?
Чытанне вершаў вучнямі напаўголаса.
Адпрацоўка выразнасці чытання.
Па жаданні адзін з вершаў дзеці завучваюць на памяць.

***Работа з тэкстам “Прафесіі”.***

Чытанне тэксту вучнямі напаўголаса; чытанне ланцужком.

– Прачытайце яшчэ раз назвы прафесій, якія сустрэліся ў тэксце.

– Раскажыце, чым займаюцца людзі кожнай з гэтых прафесій.

– Якая прафесія самая важная? *(Арганізуецца калектыўная гутарка пра прафесіі бацькоў, пра мары вучняў аб будучых прафесіях.)* Перачытайце тэкст яшчэ раз сам сабе.

– Якую назву можна яму даць? (Напрыклад: “Прафесіі”.)

**Падвядзенне вынікаў урока.**

**Рэфлексіўны аналіз дзейнасці вучняў.**